Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная Зьмена

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.
Кошт асобнага № —2 кап.

№ 194 (1161) | СУБОТА, 23-га жніўня 1930 г.

КІТАЙСКАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ—ПЕРАМОЖА

XVI зьезд УсеКП(б) ня толькі даў правільны аналіз палітычным абставінам у Кітаі, але і правёў цэлы рад конкрэтных даных, якія красамоўна сьведчаць аб няўхільным разьвіцьці рэвалюцыйнага руху ў краіне.

Яшчэ нядаўна міжнародны соцыял-фашызм прывітаў ката Чан-Кай-шы, як вызваліцеля і зьбіральніка Кітаю. Опортуністыя ў шэрагах комуністычнага Інтэрнацыянала вышуквалі з дапамогай мік оскопу элемэнты „консолідацыі" Кітаю і будавалі тэорыю аб працяжным пэрыодзе зьбіраньня рэвалюцыйных сіл у гэтай краіне. Цяпер толькі сьляпы можа ня бачыць у Кітаі руху жалезных атрадаў рэвалюцыі, якія зьбіраюць вакол сябе дзесяткі мільёнаў рабочых і сялян і наводзяць страх на сваіх клясавых ворагаў.

Для характарыстыкі вастраты клясавай барацьбы ў Кітаі даволі прывесьці пасобныя водгукі найбольш уплывовага сусьветнага буржуазнага друку аб кітайскай Чырвонай арміі. Зьвярыная нянавісьць буржуазіі да кітайскай Чырвонай арміі лепш усяго паказвае, якую сур'ёзную сілу прадстаўляюць комуністы ў Кітаі.

„Таймс" піша: „Новы рух сам па сабе ня столькі палітычны, колькі грабежніцкі"... Помесь комунізму з бандытызмам—вось якая сьмяротная небясьпека Кітаю".

Амэрыканскі часопіс „Каррэн Гісторы" у ліпнеўскім нумары за 1930 год так характарызуе рэвалюцыйныя войскі: „Вялізарныя тэрыторыі наводнены так званымі комуністычнымі атрадамі, якія ў сапраўднасьці складаюцца толькі з бандытаў, кіруюцца дэзэртырамі розных армій, падхапіўшых абрыўкі комуністычных лёзунгаў і прагна ўвабраўшых думку аб захопе маёмасьці багатых і разьдзеле яе паміж беднымі".

Цэнтральны орган нямецкага соцыял-фашызму „Форвэртс" імкнецца найлепшым чынам зьняславіць кітайскія клясавыя арміі, заяўляючы:—„Гэта (г. зн. „чырвоныя" арміі)—дзіўная сумесь фанатыкаў—комуністых, паўстаўшых сялян, профэсыйных ваякоў, дэзэртыраў з урадавых армій і бандытаў".

Гэтыя ацэнкі буржуазіі і соцыял-фашыстых наўзьдзіў супадаюць з тымі эпітэтамі, якія даваліся расейскім бальшавікам у 1917 г. Словы „салдатчына", „дэзэртыр", „бандыт" і г. д. сыпаліся з вуснаў імпэрыялістых і меншавікоў, калі яны гаварылі аб расійскіх бальшавіках. Гэта ня шкодзіла, аднак, працоўным масам ацаніць сапраўдную сілу бальшавізму і згуртавацца вакол сьцягу бальшавікоў. Тое-ж самае адбываецца зараз у Кітаі. Няма такога кутка ў краіне, дзе-б мілітарыстым ня прышлося мобілізаваць усе сілы для барацьбы з комунізмам.

Ня толькі на поўдні Кітаю, але і на поўначы—на бацькаўшчыне Чжан-Сюэ-Ляна, і ў царстве „прыкладнага" генэрала Ен-Сі-Шана—сьпешна фармуюцца організацыі для барацьбы з комунізмам. Імпэрыялістыя больш за ўсё папрацаваўшыя над раздробленьнем Кітаю і распальваньнем генэральскай вайны, зараз упрашаюць генэралаў аб'ядначца ў „імя ратаваньня цывілізацыі" і ўзываюць да іх патрыётызму. Заклікі імпэрыялістых за „патрыотычнай" абароны Кітаю нікога не абманулі. Фронт барацьбы ў Кітаі зараз зусім вызначыўся. Кляса супроць сваіх клясе. „Таймс" у артыкуле ад 5-га жніўня быў прымушан прызнаць:—„Карэньні зла ляжаць у адчайным становішчы сялянства паўсюды за выключэньнем паасобных абмежаваных раёнаў". А амэрыканскі часопіс „Каррэн Гісторы", разводзячы філёзофію аб прычынах грамадзянскай вайны ў Кітаі, сумна заяўляе:—„Лёзунгі (г. зн. комуністычныя) знаходзяць глыбокі водгук у народзе, які на працягу 19 год быў перагружаны падаткамі і неў дрэнны ўрад". Агенцтва Рэйтэр паведамляючы аб набліжэньні комуністых да варот „Ханькоу", прызнае, што „сяляне ўстанаўляюць сяброўскія адносіны з Чырвонай Арміяй".

Усё гэта сьведчыць аб тым, што асноўныя факты кітайскай рэвалюцыі сапраўды атрымоўваюць усё большае прызнаньне нават з боку ворагаў. З паасобных разьядненых, дрэнна зьвязаных між сабою атрадаў вырасла паважная армія кітайскіх рабочых і сялян, якая не абмяжоўваецца абаронай супроць кітайскай буржуазіі і абшарнікаў, але ставіць перад сабой задачу захопу ўлады. Кітайскія комуністыя паказваюць мільёнам працоўных, што яны ня толькі ўмеюць уміраць за справу комунізму, але і здольны вырашыць асноўныя пытаньні аграрнай рэвалюцыі, увайсьці ў барацьбу з імпэрыялізмам і зьнішчыць эксплёатацыю рабочае клясы. Ня дзіўна, што імпэрыялістычны друк б'е трывогу: сьцяг Саветаў ужо ўзьнесены над тэрыторыяй, якая ахоплівае 200 мільёнаў насельніцтва.

Наступ кітайскай рэвалюцыі выклікае ўзмоцненую мобілізацыю сусьветнай контр-рэвалюцыі. Імпэрыялістыя пускаюць у ход усе сродкі, каб не дазволіць чырвоным арміям умацавацца ў буйнейшых прамысловых цэнтрах і стварыць прочныя базы для кіраўніц ва рэвалюцыйным рухам. Шалёная кампанія імпэрыялістых супроць Кітаю, патокі хлусьні і дзікіх вылумак, якія выліваюцца на кітайскіх комуністых, праследуюць вызначаную мэту—стварыць дымавую заслону для ліхаманкава падрыхтоўваемых ваенных выступленьняў, для інтэрвэнцыі супроць кітайскай рэвалюцыі.

Соцыял-фашыстыя адкрыта і цынічна апраўдваюць адзіны фронт імпэрыялістых у Кітаі супроць кітайскай рэвалюцыі. Бэрлінскі „Форвэртс" у перадавіцы ад 14 жніўня прадракаючы паражэньне комуністых і пераконваючы нанкінцаў скарыстаць падтрыманьне імпэрыялістых, піша: Аслаблены нанкінскі ўрад непазьбежна будзе прымушан, пры падаўленьні комуністычнага паўстаньня, проста ці ўскосна абаперціся на чужаземныя дзяржавы".

Яшчэ больш нахабна апраўдвае інтэрвэнцыю імпэрыялістых у Кітаі французскі соцыял-фашысцкі орган „Пэпль", са слоў якога: „Кітаю ізноў пагражае анархія, дзякуючы чаму чужаземныя дзяржавы пасылаюць ваенныя суды і войскі для абароны сваіх грамадзян".

У цяперашніх умовах дзяржавам было-б надта цяжка зрабіць інакш.

„Комуністычны Інтэрнацыянал мобілізуе масы на абарону кітайскай рэвалюцыі. Адна сэкцыя Комінтэрну за другою аб'яўляюць ударную кампанію пад лёзунгам—„Рукі прэч ад Кітаю". Абарона рэвалюцыі ў Кітаі—справа працоўных усяго сьвету. Кожны дзень прыносіць усё больш яркія факты, каторыя паказваюць, якая сьмяротэльная небясьпека пагражае кітайскай рэвалюцыі. Аднак эканомічны крызіс у Кітаі, які ўсё паглыбляецца, бездапаможнасьць кітайскай буржуазіі і цяжкая нэндза шырокіх мас усё больш павялічвае армію нездаволеных і паўстанцаў. Якія-б ні былі ў далейшым цяжкасьці, кітайская рэвалюцыя, ідучы наперад пад сьцягам Комінтэрну, і падтрыманая сусьветным пролетарыятам, не азьбежна пераможа.

„Вандэрвэльдэ выехаў у Кітай, дзе ён мае намер прачытаць шэраг лекцый".
(З тэлеграм).



Настаўнік з Амстэрдаму

Мітынг чэха-славацкіх пролетараў у гонар конгрэсу Профінтэрну

ПРАГА. На мітынгу, організаваным чырвонамі профсаюзамі Прагі ў гонар адкрыўшагася ў Маскве конгрэсу Профінтэрну, прысутнічала звыш 3 тысяч чалавек—рабочых, беспрацоўных, рабочай моладзі і жанчын. З дакладам выступіў член ЦК комуністычнай партыі Чэха-Славакіі т. Гутман. Ад чырвоных профсаюзаў Чэха-Славакіі выступіў т. Запатоцкі. Потым выступіў рад рабочых прадстаўнікоў буйнейшых заводаў Прагі і Кляраднорскага гамарнага заводу. Сход быў распушчан паліцыяй пасьля выступленьня комсамолкі-работніцы, якая заклікала да барацьбы за зьнішчэньне капіталізму і ўстанаўленьне дыктатуры пролетарыяту.

Літва

Замах на начальніка крымінальнай паліцыі Рустэйку

КОЎНА, 20.—У гасьцініце „Контынэнт" зроблен замах на начальніка літоўскай крымінальнай паліцыі Рустэйку.

Рустэйка цяжка ранены. Двое, рабіўшыя замах, арыштаваны. Замах, як паведамляюць, зроблен па палітычных матывах.

Адзін з іх, студэнт Войцкевіч, па вестках газэт састаяў раней у асабовай ахраны былога літоўскага дыктатара Вальдэмараса, і быў у яго на кватэры, другі—былы слухач вайсковай школы і актыўны член нацыянальнай організацыі моладзі.

Па паведамленьнях газэт, Рустэйка быў быццам-бы запрошан імі ў гасьцініцу пад прадлогам, што яму будуць зроблены важныя паведамленьні.

Ангельскія войскі вярнуліся ў Шанхай

Лёндан, 20. *Па вестках з Кітаю ангельскія войскі, пакінутыя ў свой час у Чанша і Ханькоў, зьвярнуліся назад у Шанхай на крэйсэры.*

УСІМ ОРГАНІЗАЦЫЯМ ЛКСМБ

ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ СКЛІКАЕМЫ НА 28 ЖНІЎНЯ 1930 ГОДУ ПЕРАНОСІЦЦА.

Аб дню скліканьня будзе паведамлена асобна.

Сакратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.



Усебеларуская выстаўка сельскай гаспадаркі і прамысловасьці

Працаўнікі замежнага друку ў БССР

21 жніўня ўпаўнаважаны НКЗС пры ўрадзе БССР тав. Ульянаў прыняў прадстаўнікоў замежнага буржуазнага друку—амэрыканскай прэсы п. Дойса і п. Гіндуса, і ангельскай прэсы пані Аду Чэстэртон і пані Галеву Дунхан.

Разам з т. Ульянавым прадстаўнікі замежнага друку наведалі 1-ую ўсебеларускую выстаўку сельскай гаспадаркі і прамысловасьці, дзе іх прыняў і даваў тлумачэньні член дырэкцыі выстаўкі тав. Кіпрыянец.

Выстаўка зрабіла на дэлегацыю вялікае ўражаньне.

П. Дойс і п. Гіндус пакінулі ў павільёне старага і новага быту запісы аб сваіх уражаньнях, дзе паміж іншым кажуць, што выстаўка зьяўляецца лепшым доказам вялізарнага росту і разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры Беларускай ССР.

22 жніўня п. Чэстэртон і п. Дунхан выехалі ў Кіеў, а п. Дойс і п. Гіндус у Слуцак, дзе яны зьбіраюцца наведаць шэраг колгасаў.

* * *

21 жніўня ўпаўнаважаны НКЗС пры ўрадзе БССР т. Ульянаў прыняў прадстаўніка нямецкай рабочай газэты т. Гэрманса.

Польшча

Арыштаваны беларускі дэпутат Дварчанін

ВАРШАВА, 20.—Газэта „Польска" паведамляе аб тым, што арыштаваны сэкратар сойму, член Беларускай рабоча-сялянскай фракцыі—Дварчанін. Абставіны арышту наступныя: У вёсцы Алекшыцы, Горадзенскага павету, на царкоўным пляцы сабраліся 2000 сялян. Дэпутаты Дварчанін і Валынец організавалі мітынг. Паліцыя аддала загад разыйсьціся. У адказ удзельнікі мітынгу асыпалі паліцэйскіх градам каменьняў і адкрылі па іх агонь. Адзін паліцэйскі быў ранены. Ня маючы магчымасьці справіцца з дэмонстрантамі, паліцыя патрабавала дапамогі з Гродна.

Паліцыя ўстанавіла нібы разам з іншымі быў дэпутат Дварчанін.

„Новае таварыства навуковага дасьледваньня комунізму"

Таварыства ставіць сабе мэтай барацьбу з комунізмам шляхам дакладаў, выдавецкай дзейнасьці і публічных дыскусій

ВАРШАВА, 20. Уладай зацьверджан устаў новага таварыства пад назвай „Т-ва навуковага дасьледваньня комунізму". Гэтае т-ва ставіць сабе мэтай барацьбу з комунізмам шляхам дакладаў, выдавецкай дзейнасьці і публічных дыскусій. Газэты паведамляюць, што ў дзейнасьці новага т-ва прымуць удзел чыноўнікі, якія займаюцца комунізмам у сілу сваіх службовых абавязкаў. Інакш кажучы, новае „навуковае" таварыства будзе, відочна, кіравацца былымі паліцэйскімі чыноўнікамі, якія спэцыялізаваліся ў пытаньнях барацьбы з комуністычным рухам.

„Візыт далікатнасьці"

Польскі друк імкнецца абмаляваць паездку прэзыдэнта Масьціцкага ў Эстонію, як „просты візыт далікатнасьці".



Візытная картка

ІСКРЫ РАДЫЁ

— Бомбэйскі камітэт усеіндыйскага нацыянальнага конгрэсу па правядзеньню байкоту пастанавіў абвясьціць пад байкотам 24 эўрапэйскія прадпрыемствы.

ЯНЫ ПАКІДАЮЦЬ ПОЗЫЦЫІ СОЦЫЯЛІЗМУ

Трусы, дэзэртыры з фронту соцыялістычнай будоўлі—ганьбяць комсамол

САРВАЦЬ МАСКУ І ВЫГНАЦЬ З КОМСАМОЛУ ПРЫМАЗАУШЫХСЯ, КУЛАЦКІХ ПАДПЯВАЛ, ШКУРНІКАЎ І КАР'ЕРЫСТЫХ

Вось яны—дэзэртыры з фронту колектывізацыі

У комуне Леніна, Г радоцкага раёну (Віцебшчына), комсамолец Шаўчэнка (ён-жа член бюро ячэйкі) увесь час скардзіўся, што комуна яго не здавальняе. Бюро ячэйкі не рэагавала на яго скаргі. Калі Шаўчэнка пашоў у адпачынак, дык накінуў на кватэры заяву, што больш у комуну ня прыдзе і просіць яго выключыць з яе членаў.

Падобныя выпадкі мелі месца і ў Віцебскім прыгарадным раёне. У колгасе **„Чырвоны Пуцілавец“** комсамолец **Рыжыкаў Шавель** нядбайна адносіўся да работы, некалькі раз кідаў на полі плуг, каня, а сам прыходзіў у праўленьне, крычаў, лаяўся, гаварыў, што больш ня будзе працаваць у колгасе. Ячэйка, замест навастрыць вакол гэтага грамадзкую думку, накіравала Рыжыкава на працу па загатоўцы мяса ў спажывецкае таварыства.

У комуне „Іскра Леніна“, Віцебскага раёну, комсамолец **Р. Штэйн** пабыў комунарам усяго 2 месяцы і як толькі атрымаў даведку, што зьяўляецца комунарам, дык заразжа паехаў у Магілеўскую профтэхшколу. Тое самае зрабілі і комсамольцы **Назавы** Пятро і Іфоцыя. Пабыўшы ў колгасе некалькі месяцаў, яны падалі заяву: **„Нам няма сэнсу быць у комуне. Просім выключыць з ч енаў комуны, бо паедзем да маткі у Ленінград, дзе будзем вучыцца“.**

Парт'ячэйка зусім не рэагавала на гэта нездаровае зьявішча. Калі старшыня комуны запытаўся ў сэкратара ячэйкі Шышкова, што рабіць з комсамольцамі, якія уцякаюць з комуны, дык ён адказаў:— **„Добра і робяць, ха у трояцца на вытворчасьці“.**

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па дэзэртырах з фронту колектывізацыі.

Лук'яновіч.

Тры факты

аб прымазаўшыхся да комсамолу шкурніках, кар'ерыстых, дэзэртырах з гаспадарчага фронту

Комсамолец Гарбачэўскай ячэйкі, Расонскага раёну (Полаччына), Капілкоў Барыс—сын саматужніка, у студзені г. г. быў мобілізаваны райкомам комсамолу на лесанарыхтоўкі. Але працаваць не захацеў і ўцёк у Ленінград. Ячэйка і райком КСМ выключылі яго з шэрагаў комсамолу як дэзэртыра з гаспадарчага фронту.

Гэтую пастанову Капілкоў аскардзіў у Полацкі АКК КСМ, напісаўшы доўгую аповесьць на 9 старонках аб сваёй „актыўнасьці“ ў працы і г. д.

Вось некалькі характарных вытрымак з яго л ста:

— З таго часу, як я уступіў у комсамол (1928 г.) я быў самым актыўнейшым комсамольцам... (ідзе пералічэньне ўсіх яго абавязкаў, якія ён выконваў). Ведаючы, што ў вёсцы мне няма ў каго набыць ведаў, я рашыў ехаць у горад, паступіць на завод. Райком мяне не адпушчае, бо ў раёне не хапае работнікаў. Але ў мяне была адна думка—паехаць у Ленінград. Думаў-гадаў, пасьля, атрымаўшы тэлеграму—„Прыяжджай хутчэй ёсьць праца“—я рашыў паехаць без дазволу райкому. Я ведаў, што за гэта выключаюць з комсамолу, але думаў, ці няўжо-ж ня прымуць пад увагу маю актыўную работу ў комсамоле.

Вось другі прыклад:

Комсамолец таго-ж раёну—Гурнасенка Алесь, які сустрэўся з неабходнасьцю ўступленьня ў колгас, не жадаючы зрабіць гэтага выехаў у Ленінград, быццам лячыцца. У Ленінградзе яму ўдалася ўстроіцца на папяровай фабрыцы. У лісьце да таварыша ён піша што атрымлівае ў месяц 100 руб і што на вёску ўжо вярнуцца ня думае. Колектывізацыя—гэта ўпартая і цяжкая работа. Навошта гэта яму здалося. Комсамол яму-ж ужо непатрэбен. Ён піша:

— Пры паступленьні на фабрыку альбо на завод ком амол ніякай ролі не адыгрывае.

Ячэйка выключыла Гурнасенку з шэрагаў комсамолу як дэзэртыра, пралезшага ў комсамол для сваіх асабістых мэтаў.

Прыклад трэці:

Комсамолка тэй-жа організацыі—Студзянкова Алеся, серадначка. Не хацела ўступаць у колгас. Адмаўлялася розьнымі „об'ектыўнымі“ прычынамі, далёкай адлегласьцю колгасу і інш. Калі ўбачыла, што організацыя гэтым манэўрам ня верыць, яна знашла адгаворку ў тым, што ў колгасе для моладзі няма забаў(!?)

„Тэорыя“ Студзянковай атрымала ў ячэйцы рашучы адпор. Студзянкова выключана з комсамолу.

Прыведзеныя прыклады яскрава выкрываюць твар прымазаўшыхся да організацыі кар'ерыстых, шкурнікаў, якія прыкрываюцца комсамольскім білетам.

Багданаў.

Спужаліся цяжкасьцяў!

Віцебскі АК ЛКСМБ паслаў двух комсамольцаў-брыгадзіраў у Лёзьненскі р-н для правядзеньня перавыбараў бюро комсамольскіх ячэек. Адзін з брыгадзіраў—**Шэйман** папаў якраз на перавыбарчы сход **Калышанскай ячэйкі ЛКСМБ.** Перавыбары цягнуліся цэлую ноч. Заслухалі справаздачу сэкратара, выступалі ў спрэчках, а ад брыгадзіра ніхто і слова не пачуў. РК КСМ дае заданьне брыгадзірам пераключыць усю сваю работу па перавыбарах бюро, на задачы сіласаваньня і ўборкі ўраджаю. Убачыўшы ўмовы працы колгасных ячэек, брыгадзіры спужаліся цяжкасьцяй. Адзін з іх т. Ісхізаў не зьяўляўся два тыдні ў РК КСМ і не паведаміўшы яго уцёк з раёну. Так па сёньняшні дзень і не вярнуўся“ А другі брыгадзір—Шэйман, заразіўшыся прыкладам таварыша, таксама зьбіраецца ў падарожжа.

Шэйману РК КСМ даў заданьне ехаць у ячэйку „Прогрэс“, дзе ён павінен будзе працаваць у якасьці сэкратара ячэйкі. Ён пачаў адняквацца:—**Ня маеце права скарыстоўваць мяне куды вам захочацца. Я—брыгадзір АК ЛКСМБ і куды сам захачу, туды і паеду. Я не падпарадкоўваюся РК КСМ і справаздач аб сваёй рабоце даваць ня буду.**

К. КАРОЛЬ.



Дэзэртыр з фронту соцыялісты н га будаўніцтв

— „Хай раней наладзяць справы, тады і я пайду!“

У колгасе „Новае Сяло“ Сенінскага с-с (Віцебшчына) ёсьць комсамольская ячэйка з 25 чалавек. У колгас уступіў толькі адзін комсамолец ды і той паказаў сябе нявытрыманым, падрываў працоўную дысцыпліну і г. д.

У члена бюро ячэйкі—**Латышова,** які быў два гады сэкратаром, толькі і работы, што пайсьці на вячорку, напіцца і вылаяць усіх. Калі трэ' было сабраць брыгаду для дапамогі колгасу, ён сказаў: —**„Хай колгас дапаможа мне, а тады і я яму.** Нежаданьне ісьці ў колгас ён тлумачыць тым, што там вельмі дрэнна: „Хай раней наладзяць справы—тады і я пайду“.

Тут-жа пад бокам райком комсамолу і некалькі партыйцаў, але яны на гэта не зьвяртаюць ніякай ўвагі.

Пракаповіч.

Пратасеня „сэкратарствуе“

Комсамолец Пратасеня Ры[...] (Слуцкі раён) уступіў у комса[...] каб зрабіць сабе кар'еру. Пра[...]сеня набраў шмат нагрузак, нідзе нічога не рабіў. Ён **сэкратаром ячэйкі, сяб[р]ам [...] кому комсамолу, старшы[ня] тарфянага таварыства, сябр[ам] рэвізійнай камісіі крэдытн[ага] таварыства, сябрам сельсав[ету,] сябрам камітэту ўзаемад[а]могі райінструктарам па [...] старшынёю ячэйкі „П. і г. д і г. д.** Праца па ўсіх [...]тых організацыях зусім запу[...]. Ён хацеў паказаць толькі зьяўляецца комсамольцам—„[ак]вістым“. Комсамольскую яч[эйку] „актывісты“ развалілі, [...] частка батрацка-бядняцкай мо[ладзі] вышла з комсамолу. Яго ста[ра]нямі было выключана з комса[молу] 8 чалавек, а ў ячэйцы ўсяго лічыцца 15.

Пры разгортваньні колекты[візацыі] Пратасеня імкнуўся пра[...] старшынёю колгасу. Так яно і [вы]шла, організаваўся колгас і Пр[ата]сеня быў абран яго старшы[нёй]. Прабыўшы два тыдні на гэтай [па]садзе, спалохаўшыся цяжкась[цяў] Пратасеня ўцёк без дазволу ра[йко]му комсамолу і членаў колга[су ў] местачковае спажывецкае та[вары]ства. РК КСМ вярнуў яго зноў [у] колгас, даўшы суровую вымо[ву з] апошнім папярэджаньнем. [...] гэтага ён ужо быў назначан [сэкра]таром колгасу.

З гатага часу Пратасеня [...]нае п'янку з кулакамі. Пра [...] была напісана заметка ў [...] „Ч. З“. Факты цалкам пацьв[ердзі]ліся, але захадаў ніякіх ня [...]няві.

Пратасеня арудаваў. Пр[...] грошы сялян. А ў комсамо[льскай] ячэйцы ўжо больш як два [...] ня было ніводнага сходу.

Ніякіх політычна гаспад[арчых] пытаньняў у ячэйцы не р[...]раецца. У колгасе вялікія [не]радкі. **Згніло каля 15 возоў [...]на, спазьніліся з жнівом.** А [Пра]тасеня ў абодвых месцох „[сэкра]тарствуе“. Цяпер у яго адна [...] як найхутчэй нажыцца ў ко[лгасе] кінуць яго разам з комсамол[ам і] ўцячы.

Пратасеням ня месца ў шэ[рагах] комсамолу. **Зорны і [...]**

Рашэньні XVI зьезду ЎсеКП(б)—у масы!

Ці вялі правыя фракцыйную работу

Сьмяхотныя скаргі на „прапрацоўку“

Зараз, калі ўжо даволі добра вядома, якую фракцыйную барацьбу супроць партыі вялі правыя, сьмешна чытаць тагочасную заяву лідэраў правых аб тым, што іх „прапрацоўваюць“, што ім „перашкаджаюць працаваць“. Такія заявы яны рабілі ня раз

У якасьці прыкладу можна прывесьці заяву тав. Бухарына (30 студзеня 1929 г.), да якой тады-ж дэмонстрацыйна далучыліся Рыкаў і Томскі:

„Сур'ёзныя хворыя пытаньні не абгаварваюцца. Уся краіна мучыцца над пытаньнем хлеба і забясьпечаньня, а конфэрэнцыі пролетарскай пануючай партыі маўчаць. Уся краіна адчувае, што з сялянствам няладна, а конфэрэнцыі пролетарскай партыі, нашай партыі, маўчаць. Уся краіна бачыць і адчувае зьмены ў міжнародным становішчы, а конфэрэнцыі пролетарскай партыі маўчаць. Затое град рэзолюцый аб ухілах (у адных і тых-жа словах). Затое мільёны чутак і чутачак аб правых—Рыкаве, Томскім, Бухарыне і г. д. Гэта—маленькая політыка, а не політыка, якая ў эпоху цяжкасьцяй гаворыць рабочай клясе праўду аб становішчы, ставіць стаўку на масы, чуе і адчувае патрэбы масы, вядзе сваю справу, зьліўшыся з масамі“.

Пачаўшы фракцыйную работу ў габінэце Угланава, правыя перакінулі масткі на Салянку, у профсаюзны Палац Працы.

Тав. Томскі, выступаючы на партыйным зьезьдзе, таксама як і тав. Угланаў нічога не сказаў конкрэтна аб сваёй фракцыйнай рабоце.

Дзеля гэтага зьезду прышлося чакаць заявы тав. Козелева—аднаго з верных зброяносцаў правага „праваддыра профсаюзнага руху“.

Тав. Козелеў падаў у прэзыдыум зьезду асобную заяву пасьля таго, як аб ім пару фраз сказаў у дакладзе тав. Орджонікідзе. Напомнім, як гэта было.

Тав. Орджонікідзе ў сваёй прамове прывёў характарыстыку, якую Троцкі дае нашай самакрытыцы. Троцкі прапануе „асудзіць сталінскую самакрытыку як самую разбэшчаную форму партыйнага бюрократычнага плебісцыту“.

— Бачыш, ты!—заўважвае т. Орджонікідзе.—Самакрытыку, якая на такую вышыню ўзьняла актыўнасьць мас у краіне,—ён гэта называе „самай разбешчанай формай партыйнага бюрократычнага плебісцыту ў краіне“! Але, таварышы, ад Троцкага мы чулі столькі ўсякай брыды, што і гэта ня можа нас зьдзівіць. Ну, а калі правыя тое-ж самае гавораць? Вазьмеце аднаго з самых старэнных вучняў тав. Томскага, былога члена ЦК мэталістых...

Кагановіч: Намесьніка старшыні:

Орджонікідзе: ... намесьніка старшыні, фактычнага заправілу саюзу мэталістых, аднаго з самых актыўных барацьбітоў перадавой шарэнгі Томскага на VIII зьезьдзе профсаюзаў, Б. Козелева, ён піша: „Для мяне ясна, што лёзунг самакрыткі для Сталіна —такі-ж пярунавод, якім калісьці для царызму быў яўрэйскі пагром“.

Галасы: Ганьба, ганьба! (Шум).

Голас: Ён у партыі?!

Орджонікідзе: Ні ў якім разе не. ЦКК за такія мастацтвы, за такую ацэнку самакрытыкі ў нашай партыі і іншыя ня меншыя, чым гэтыя антыпартыйныя выхадкі, палічыла неабходным выключыць яго з партыі. (Аплёдысмэнты).

І вось ужо пасьля таго, як усё названа сваім імем, Козелеў піша пакаянную заяву ў прэзыдыум зьезду. А што калі-б тав. Орджонікідзе не ўпамянуў імя Козелева, напісаў-бы ён заяву зьезду, раскрыў-бы ён фракцыйныя тайны?

Фракцыйная работа ў профсаюзах

Але ня будзем гадаць і меркаваць. Заява ёсьць, і трэба разабраць гэтую заяву.

Частку гэтай заявы мы ўжо цытавалі вышэй. Зараз нас цікавіць тая частка, у якой тав. Козелеў прыводзіць некаторыя факты фракцыйнай дзейнасьці правых.

Козелеў піша:

„Правая опозыцыя імкнулася ў УсеЦСПС і ў профсаюзах стварыць другі політычны цэнтр для абострэню ЦК хацела скарыстаць 8 зьезд профсаюзаў для нападу на ЦК, для бою з ЦК, для політычнай дэмонстрацыі. Так на фракцыйным па-сутнасьці сходзе шэрагу вядомых профсаюзных работнікаў (Томскі, Угланаў, Шмідт, Мельнічанскі, Угараў, Удараў, Яглом, Гінзбург Л. і шэраг іншых таварышоў) у час VIII зьезду профсаюзаў, на якім ня было ні Лазоўскага, ні Акулава, ні Еўрэінава, ні Вэйнбэрга, было вырашана выступіць на фракцыі VIII зьезду супроць рашэньня політ-бюро ЦК аб увядзеньні ў прэзыдыум УсеЦСПС тав. Кагановіча.

На гэтай-жа нарадзе пасьпела ў тав. Томскага яго анты-партыйнае рашэньне аб уходзе са зьезду, аб патрабаваньні адстаўкі, каб ўсёй партыяй такой дэмонстрацыяй сказаць аб рознагалосьсях, пагражаючы такім чынам ЦК партыі сваім аўторытэтам у профсаюзным руху і дабіваючыся зьмены політыкі партыі такім узбочным шляхам. Томскі абачліва не жадаў выносіць на фракцыю зьезду свае рознагалосьсі з ЦК па прынцыповых пытаньнях, а рашыў эманэўраваць, паспрабаваўшы яшчэ раз супроцьпаставіць профсаюзы партыі быццам па чыста організацыйнаму пытаньню“...

Тав. Томскі з прычыны гэтай заявы нічога не сказаў. Змаўчаў. А між тым гэтая заява ізноў-такі самым канкрэтным чынам і важка выкрывае фракцыйную работу правых.

Бо-ж у заяве лістападаўскаму пленуму ЦК партыі лідэры правых [пі]салі:

„У працягу апошніх паўтара [году] паміж намі і большасьцю ЦК Усе[КП(б)] былі рознагалосьсі па шэрагу [...]ных і тактычных пытаньняў. [...] погляды мы выкладалі ў шэрагу [да]кумантаў і выступленьняў на [плену]мах і іншых паседжаньнях ЦК УсеКП(б). Мы лічым сваім [аба]вязкам заявіць, што ў гэтых [...] мелі рацыю партыя і яе ЦК. [...] погляды, выкладзеныя ў вядомых [да]кумантах, аказаліся памылковымі. Прызнаючы гэтыя свае памылкі, [мы з] свайго боку прыкладзем усе сілы [для] таго, каб разам з усёй партыяй [ве]сьці рашучую барацьбу супроць [...] ухілаў ад генэральнай лініі парт[ыі] перш-за ўсё супроць правага [...] прымірэнцтва, з тым, каб пер[...] любыя цяжкасьці і забясьпе[чыць] [...]ную і хутчэйшую перамогу [соцыялі]стычнага будаўніцтва“.

Пісалі адно, а рабілі другое. [...] гэта з сім зразумела. Раз стаў[шы на] шлях фракцыйнай барацьбы, [...] ўжо не маглі спыніцца на по[...]. Імкнучыся павялічыць свае сілы [...]выя пацягнуліся да іншых [...] опо[зыцый]ных груп і групкаў.

Ан. Ч[...]

(Працяг заўтра).

РАЗГОРТВАЙЦЕСЯ паходным маршам!

ГРУПУЙЦЕ ЎВАГУ І СІЛЫ АРГАНІЗАЦЫІ НА ПЫТАНЬНЯХ:

падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы, добрай арганізацыі хлебанарыхтовак, поўнага выкананьня ўзятых абавязкаў па сілосаваньню і сьвінага доўлі

Даць тэмпы другой бальшавіцкай сяўбе

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы па шэрагу раёнаў праходзіць нездавальняюча. Машыны не рамантуюцца, пляны не даведзены да колгасаў і вёсак, комсамольскія ячэйкі бязьдзейнічаюць.

Пухавіцкая комсамолія не пераключылася на асеньнюю сяўбу

Шэраг колгасаў Пухавіцкага раёну ўжо скончыў уборку ўраджаю і прыступіў да малацьбы, але-ж падрыхтоўка да асеньняй пасеўкампаніі ў раёне яшчэ не разгарнулася.

Раённы камітэт комсамолу ня выпрацаваў конкрэтных мерапрыемстваў па ўдзелу комсамольскай організацыі ў правядзеньні пасеўнай кампаніі, не мобілізаваў увагі комсамольскіх ячэек на правядзеньне падрыхтоўчай працы да ачысткі насеньня, рамонту інвэнтару, організацыі брыгад у колгасе.

Колгасьнікам не растлумачаны пляны асеньняй сяўбы. А ўжо аб працы сярод адзіналічных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па падрыхтоўцы іх да асеньняй сяўбы і гаварыць ня прыходзіцца. Гэты вучастак забыты.

Вішня.

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы не распачата

Падрыхтоўка да асеньняй пасеўнай кампаніі па Лагойскім раёне не распачата. Плян асеньняй сяўбы ня складзены і не даведзены да сельсаветаў, колгасаў і вёсак.

Сельска-гаспадарчыя машыны не рамантуюцца, бо не організаваны рамонтныя майстэрні і ня створаны брыгады.

Партыйныя, комсамольскія ячэйкі, сельсаветы і РВК не праводзяць растлумачальнай працы да падрыхтоўкі к асеньняй сяўбе і пашырэньню пасеўнай плошчы пад азімымі культурамі.

Таксама не праводзіцца працы па разьмеркаваньню ўраджаю ў колгасах „Бальшавік“ і інш.

Вакол усіх гэтых пытаньняў райком комсамолу не мобілізаваў увагу комсамольскіх ячэек, а райкомпартыі ня прымаў ніякіх мер да разгортваньня гэтай працы.

„Лёгкі Кавалерысты“.

Прымусім Корзунаўскі СКТУ працаваць

Корзунаўскі СКТУ ніякай падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы не праводзіць. Трыер, арфа і малацілкі не падрыхтаваны,—чакаюць рамонту.

Корзанаўскі СКТУ бязьдзейнічаў і ў час уборачнай кампаніі,—не дапамагаў беднаце і сем'ям чырвонаармейцаў.

Комсамольская організацыя павінна ажывіць працу Корзанаўскага СКТУ, організаваць брыгады для рамонту яго машын, для ачысткі насеньня і малацьбы з тым, каб у час асеньняй пасеўкампаніі аказаць дапамогу беднаце і сем'ям чырвонаармейцаў.

Варэнік.

Аб'явіце барацьбу за якасьць сілосу

Організуйце пры ўсіх комсамольскіх вясковых газэтах аўторытэтныя консультацыі спэцыялістых па сілосаваньню

Усім саюзным, рэспубліканскім, краёвым і абласным зямельным кіраўніцтвам

Масавасьць сілосаваньня, рознастайнасьць сілосных культур, незнаёмства насельніцтва з тэхнікай сілосаваньня і недахоп кадраў ставяць пад пагрозу якасьць сілосаваньня.

Прапануем, побач з барацьбой за колькасьць сілосаванай масы, весьці ўзмоцненую барацьбу за якасьць сілосаваньня. Пастаўце сваёй задачай 100% скарыстаньне ведаў агропэрсоналу, падрыхтаваных колгасьнікаў і адзіналічнікаў.

Пры ўсіх комсамольскіх вясковых газэтах організуйце аўторытэтныя консультацыі спэцыялістых па сілосаваньню. Шырока паведамеце аб гэтым вёску і ўстанавеце неадкладнае друкаваньне адказаў на запытаньні.

Рэгулярна друкуйце папярэджаньні аб памылках, на падставе практыкі мінулых гадоў і праверкі работы бягучага году. Абвясьцеце сталую радыё-гадзіну консультацый, падмацуйце працаўнікамі дасьледчыя станцыі на час кампаніі, пэратварыўшы іх у масавую навукова-кіруючую організацыю.

У пэрыод масавай закладкі склікайце шырокія конфэрэнцыі. Організуйце перасоўныя інструктарскія брыгады, забясьпечыўшы іх сродкамі перасоўваньня шляхам вылучэньня коняй, вэлёсыпэдаў, мобілізацыі аўтамобіляў. Паведамеце ўсе культасьветпункты і організатараў аб барацьбе за якасьць. Выпусьцеце спэцыяльную масавую лістоўку па сілосаваньню на падставе мясцовай практыкі. Абвясьцеце прэміяваньне за лепшую працу.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ СІЛОСНАЕ БЮРО НКЗ СССР.

Зьвяно, якое не зачапіў колгасна-вытворчы паход

Адным з важнейшых зьвеньняў колгасна-вытворчага паходу комсамолу Беларусі павінна быць выразшэньне проблемы жывёлагадоўлі, якая без утварэньня патрэбнай кармовай базы немагчыма. Таму адна з крыніц кармовай базы — сілосаваньне павінна ў вытворчым паходзе комсамолу заняць пачэснае месца. Але на справе зусім ня так. Заслуханыя на бюро Магілеўскага АК ЛКСМБ справаздачы 8 раёнаў даюць малюнак нездавальняючай працы на сілосавую будаўніцтву і безадказнасьць асобных кіраўнікоў комсамольскай організацыі за справу правядзеньня сілоснага будаўніцтва.

Тэмпы працы гэтых організацый па сілосаваньню не адпавядаюць пастаўленым задачам. Вось факты: па Чэрыкаўскім раёне выкапана 14 сілосных ям на 290 кубамэтраў, што складае па колькасьці ям 29,2 проц. пляновага заданьня. Засілосавана 54 тоны альбо 5 проц.

У Хоцімскім раёне выкапалі 7 ям і нічога не засілосавалі. Накіраваныя райкомам 54 актывістыя на дапамогу вясковым ячэйкам нічога ня зрабілі.

Больш таго ў гэтым раёне на вестках райкому плян пасеву сілосных культур, кукурузы і інш., выканалі на 550 проц., што дае магчымасьць цалкам выканаць заданьне па сілосаваньню. Аднак, гэта продукцыя можа прапасьці, бо аб ямах, траншэях для закладкі не паклапаціліся.

Па Чачэвіцкай організацыі выкапаны 3 сілосных ямы і 1 траншэя. Да сілосаваньня кармоў ня прыступілі. Райком комсамолу, райколгассаюз і РВК нічога ня робяць, каб забясьпечыць выкананьне пляну, ды нават і не разаслалі іх па сельсаветах і колгасах.

У Шклоўскім раёне выкапана 9 ям на 84 кубамэтраў, але аб сілоснай масе ня гледзячы на папярэджаньне комсамольскія ячэйкі забыліся.

Магілеўскі раён сарваў пасеў сілосных культур. Зараз у раёне пабудавана толькі 28 сілосных ям на 500 кубамэтраў, з іх засілосавана адна яма на 30 тон у колгасе Каліноўскага.

Па індывідуальным сэктары за выключэньнем двух ям, выкапаных школай сялянскай моладзі,—нічога ня зроблена.

Крыху лепш справа ў Бялыніцкім раёне, тут выкапалі 48 ям, што складае 25 проц. па колгасах і 10 проц. па індывідуальным сэктары. Да закладкі сілосных культур яшчэ ня прыступілі.

Раённыя, савецкія і коопэрацыйныя ўстановы Бялыніцкага раёну зусім не зацікаўлены справай сілосаваньня. Адпушчаны крэдыт у суме 3600 рублёў ня ўвесь атрымалі і ня выкарыстан на сілоснае будаўніцтва. Райвыканком нават ня вынес пастановы, якая-б абавязвала сельсаветы заняцца справай сілосаваньня.

Рэкорд за Клімаўшчынай

Па Лупалаўскім раёне выкапана 12 ям на 2362 кубамэтры і адна траншэя ў комуне „Беларусь“ на 45 кубамэтраў. Райком комсамолу правёў тры суботнікі на сілосаваньню і ўсё-ж яшчэ не засілосавана ніводнае тоны.

Зусім нічога ня зроблена па сілосу Клімаўскай комсамольскай організацыяй.

Прыведзеныя факты сьведчаць, што пачаты колгасна вытворчы паход комсамолу яшчэ не ўзварушыў усёй комсамольскай організацыі на выкананьне пляна ў сілоснага будаўніцтва.

Яны сыгналізуюць аб тым, што ў выпадку няпрыняцьця рашучых крокаў, сілоснае будаўніцтва ў адзначаных раёнах будзе сарвана.

Задача ўсёй комсамольской організацыі— зараз-жа, ня губляючы ніводнае хвіліны, разгарнуць упартае змаганьне за выкананьне пляну сілоснага будаўніцтва, капаньне ям і закладку сілоснай масы.

Б. Ліўшыц.

Патрэбен рашучы пералом

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ Ў СЬМІЛАВІЦКІМ І ЛАГОЙСКІМ РАЁНАХ НЕ РАСПАЧАТЫ. ЗАГАТОЎЧЫ АПАРАТ І ХЛЕБНЫЯ ПУНКТЫ НЕ ПАДРЫХТАВАНЫ

Комсамол павінен забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне хлебазагатовак

Чырвоныя абозы крануліся

Уборка збожжа па колгасах і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках Лёзьнянскага раёну скончана.

Шэраг колгасаў прыступіў да абмалоту. Разам з гэтым ужо пачалі прыбываць у загатоўчы пункт мястэчка Лёзна чырвоныя колгасныя абозы з збожжам.

18 жніўня ў мястэчка прыбыў першы чырвоны абоз з колгасу „Інтэрнацыянал“, які здаў 300 пудоў жыта. Колгасы Добрамысьлянскага сельсавету здалі 1000 пудоў. Кожны дзень з усіх сельсаветаў прыбываюць чырвоныя абозы колгасаў.

Усё-ж такі трэба сказаць, што комсамольскія ячэйкі прымаюць нездавальняючы ўдзел у правядзеньні хлебазагатоўчай кампаніі і організацыі чырвоных абозаў.

Кароль.

Аб хлебазагатоўках маўчаць

Падрыхтоўка да хлебазагатоўчай кампаніі па Лагойскім раёне праводзіцца надзвычайна слаба. Пытаньні хлебазагатовак не абгаварваліся яшчэ на парт. і комсамольскіх сходах.

Райком партыі і комсамолу ня прынялі ніякіх рэальных мер, якія-б забясьпечвалі пасьпяховае правядзеньне гэтай кампаніі.

Пляны ня складзены і не популярызаваны сярод колгасьнікаў і адзіналічных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

У выніку, ня гледзячы, на тое, што шэраг колгасаў скончыў уборку і прыступіў да малацьбы, хлебныя лішкі колгасамі яшчэ не здаюцца.

Комсамольскім організацыям ў час колгасна вытворчага паходу неабходна мобілізаваць усе сілы на разгортваньне працы для пасьпяховага правядзеньня хлебазагатоўчай кампаніі.

Р.

У баку ад хлебазагатовак

Комсамольская організацыя Сьмілавіцкага раёну да апошняга часу не праводзіць ніякай падрыхтоўчай і растлумачальнай працы да хлебазагатоўчай кампаніі.

Колгасьнікі і індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі ня ведаюць пляна ў хлебазагатовак па раёне і колгасам.

Райвыканком і сельсаветы ня прынялі мер, каб забясьпечыць своечасовую падрыхтоўку колгасаў і адзіналічных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак для здачы хлебных лішкаў.

Коопэрацыйныя організацыі, якія павінны праводзіць нарыхтоўку і прыём збожжа, не падрыхтаваліся. Не ўсе склады для хаваньня збожжа адрамантаваны і падрыхтаваны да ссыпкі.

Кіраўнікі-ж райкому комсамолу сваю бязьдзейнасьць у гэтай справе тлумачаць „об'ектыўнымі“ прычынамі:—зараз праходзіць уборка хлеба, таму некалі займацца падрыхтоўкаю да хлебазагатовак.

Райком партыі і райком комсамолу павінны пакончыць з безадказнасьцю ў справе падрыхтоўкі да правядзеньня шырокай хлебанарыхтоўчай кампаніі

Цім. Лавіцкі.

Хлебныя лішкі—дзяржаве

17 жніўня ў мястэчка Старыя Дарогі (Бабруйшчына) прыбыў першы чырвоны абоз, організаваны колгасам „Соцыялізм“. Чырвоным абозам здана 2860 **кілёграм збожжа.**

Пятрусь Краёвы.

Комсамольцы—гледачы

У колгасах і саўгасах **Астрашыцка-Гарадзецкага раёну (Меншчына)** было вызначана засілосаваць у гэтым годзе 670 тон, але гэтую лічбу ў сваю чаргу РВК зьменшыў да 600 тон.

Каб засілосаваць гэтую масу 600 тон, трэба выкапаць 22 сілосныя ямы і паставіць 2 сілосныя башты.

Здавалася-б, што гэтую работу раён мог-бы **ня толькі выканаць, але і перавыканаць,** на вялікі жаль капаньне сілосных ям і траншэй у колгасах і саўгасах раёну абстаіць вельмі дрэнна. Па асобных колгасах пачалі будаваць каля 7-8 ям.

Комсамольскія ячэйкі **да гэтага часу не мобілізавалі свае сілы на дапамогу колгасам.**

Лявіцкі.

НАЛЁТ НА МЦРК БРЫГАД „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“ І „САВЕЦКАЙ БЕЛАРУС

ВЫБІЦЬ З АКОПАУ ШКОДНІКАУ РАБОЧАГА ЗАБЕСЬПЕЧЭНЬНЯ

Група шкоднікаў, засеўшая ў апараце МЦРК, на працягу доўгага часу зрывала рабочае забесьпячэньне

УЗМОЦНІМ ПРОЛЕТАРСКІ КОНТРОЛЬ НАД ПРАЦАЙ МЦРК

ШКОДНІКАЎ РАБОЧАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ—НА ЛАВУ ПАДСУДНЫХ!

Паведамленьне прокуратуры рэспублікі

У зьвязку з харчавымі цяжкасьцямі, прокуратура рэспублікі з дапамогаю рэдакцыяй газэт „Савецкая Беларусь“ і „Чырвоная Зьмена“, пры ўдзеле рабочых брыгад заводу „Бальшавік“ і лёгкай кавалеры Кастрычнікаўскага райкому комсамолу правяла абсьледваньне становішча рабочага забясьпечаньня гароднінай. У выніку выяўлен цэлы шэраг агідніейшых фактаў безгаспадарнасьці, якія мяжуюцца са шкодніцтвам.

У зьвязку з гэтым прокуратурай рэспублікі арыштаваны: БУЖЫН (былы загадчык базы МЦРК), ЮДОВІЧ (загадчык базы), ІЗАКАЎ (консультант).

Далейшае сьледзтва па гэтай справе вядзецца ў тэрміновым парадку і будзе скончана ў бліжэйшыя дні.

Прокурор Рэспублікі **Н. І. Міхайлаў.**

Рэйд Лёгкай кавалеры і „Чырвонай Зьмены“

Два факты, якія гавораць за сябе

Пры налёце на буфэт абутковай і шпалернай фабрык выяўлена наступнае:

На абутковай фабрыцы, дзе працуе 1300 рабочых, у час „налёту“ у буфэце былі толькі агуркі і чорны хлеб. Абедаў не хапае і дастаўляюцца яны несваечасова.

Буфэт працуе на тры зьмены. Продукты прывываюць толькі адзін раз вечарам, так што на ранішняй зьмене ствараецца вялікая чарга, а другой зьмене ўжо нічога не застаецца.

Рабочыя скардзяцца на вялікія чаргі, якіх можна ўнікнуць правільна разьмеркаваўшы тавары.

Зусім іншы малюнак мы сустрэлі на **шпалернай фабрыцы.** Пры гэтай фабрыцы ёсьць ларок, да якога прымацавана 250 чалавек. **Пры „налёце“ ў ларку была фашырка, язык, сырнікі, чорны і белы хлеб і баранкі.**

Рабочы можа атрымаць гэта ў буфэце ня толькі ў час сьнеданьня але ў выхадныя дні і ў час працы. Ларок абслугоўвае ня толькі рабочых шпалернай ф-кі але і іншыя арцелі па-суседзтву.

Прыходзіцца толькі дзівіцца, чаму такая розьніца паміж колектывамі у забясьпечаньні рабочых колектываў.

Грак і Русінаў.

Прышлі мы на завод „Энэргія“ у час абеду. У буфэце **2 вакенцы** але адпускаюць з аднаго. Другое вакенца закрыта, бо няма вагароў. Чарга даўжэзная. Буфэт увесь у брудзе, гігіенічныя правілы не захоўваюцца. У сталоўцы—ня лепш. Пасуда выціраецца бруднымі ручнікамі, не хапае талерак, важэй. Рабочыя вырываюць адзін у аднаго з рук шклянкі, каб хутчэй папіць гарбаты і не спазьніцца на працу. Вельмі часта рабочыя застаюцца без абеду, бо сталоўку забясьпечваюць харчамі з перабоямі.

— Калі загадчык знаходзіцца бліжэй да складу, дык ён атрымае і рыбу і інш., а хто далей, на ўскраіне—нічога не атрымліваюць. Буфэты і сталоўкі забясьпечваюцца бясплянава, — гаворыць загадчык сталоўкі заводу „Энэргія“.

На „Чырвонай Зорцы“ нам скардзіліся рабочыя, што продукты для абеда вельмі часта прывозяць пасьля абедзенага перапынку, з-за чаго прыходзіцца рабіць прагулы.

На днях рабочым на абед прывезьлі толькі хлеб і яблыкі, тады як склад меў магчымасьць забясьпечыць буфэт „Чырвонай Зоркі“ іншымі продуктамі, як памідоры, гуркі і іншыя.

Бюлін і Кравец.

А бульбы ўсё няма

Даведаўшыся, што на базе МЦРК маецца 16 тон бульбы і даслана на базу таварнай станцыі яшчэ тры вагоны бульбы для разгрузкі, рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь“ а 1 гадз. 30 хв. дня 22 жніўня ўчыніла налёт на садова-гародныя магазыны, крамы і ларкі ЦРК.

— Цэнтральная!.. Калі ласка дайце 3-27.

— Гэта што?

— Крама № 9 ЦРК.

— Скажэце, калі ласка, ці маецца сёньня ў продажу бульба?

— У нас няма, бо яе прадае магазын № 104 (Замковая вул.), зараз адкажам ці ёсьць там.

Троххвілiннае чаканьне і адказ:

— „Бульбы ў іх няма ўжо з тыдзень“.

— Цэнтральная,—2-40!..

— Магазын № 12 слухае,—нясецца ў тэлефонную трубку.

— Ці прадае сёньня магазын бульбу?

— А хто пытаецца?—чуецца жаночы пісклівы голас.

— Рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь“. Вельмі трэба ведаць.

— Няма ў нас бульбы ўжо чацьверты дзень.

— ...Алё, алё... Гэта магазын 183? (Няміга). Як, бульба сёньня ёсьць?

— Бульбы няма ўжо каля двух тыдняў,—ветліва адказвае ў трубку загмагам т. Рубенчык.

Аднолькавае становішча з бульбай і ў магазыне № 118 (рог вул. Ленінскай і Карла Маркса) і ў шмат іншых крамах і ларках ЦРК. Бульбы няма, бульбу чакае рабочы спажывец, бульбу чакаюць загадчыкі магазынаў,—каб спыніць чалавечы натоўп за бульбай, каб забясьпечыць бульбай працоўнае насельніцтва і зьнішчыць спэкуляцыю на прыватным рынку.

Бульбы няма... А ў гэты самы дзень, замест задаволіць насельніцтва бульбай—транспарт ЦРК, па загаду праўленьня, задавальняе магазыны... гарбузамі.

Ці доўга працягнуцца галавацяпства і злачынствы па забясьпечваньню рабочага спажыўца гароднінай і ў першаю чаргу бульбай?

Ці доўга яшчэ гэтыя злачынствы галавацяпаў з ЦРК застануцца не пакаранымі?

ЦКК-РСІ, слова за табой!

А.

Малюнак з натуры

Зусім нядаўна адбыліся перавыбары праўленьня **МЦРК.** Замест 9 **членаў**, абрана 13. Але-ж гэта ня значыць, што наведвальнікі, прыходзячы ў праўленьне **МЦРК**, застаюць каго-небудзь з членаў на месцы. Вось, напрыклад, адзін малюнак.

Прыходзіць наведвальнік:

— Дзе ў вас старшыня праўленьня т. Кац?

— Ён у адпачынку.

— А яго намесьнік?

— У яго пакоі.

— Там нікога няма. А можа скажаце, дзе можна ўбачыць загадчыка організацыйным аддзелам?

— Загадчык оргаддзелу, т. **Альпяровіч**, таксама ў адпачынку.

— А яе намесьнік?

— Сядзіць там у пакоі.

— Ды там-жа нікога няма, акрамя канцылярскіх прыладаў.

— А ён мусіць куды-небудзь вышаў.

І так амаль кожны дзень. Пачынаецца з раніцы хаджэньне „па муках“ наведвальнікаў у вялізарным памяшканьні Цэрабкоопу. З аднаго стала да другога, з паверху на паверх, з пакою ў пакой. І так з раніцы да канца працы, а праўленцаў усё няма.

Праўленцы пабаяліся прапусьціць курортны сэзон і пасьпяшыліся. **Альпяровіч** паехала на 6 **тыдняў, Кац**—на месяц і г. д.

У праўленьні засталіся ўсе новыя працаўнікі, якія ня ведаюць добра сваёй працы, а таму наведвальнікі азлоблены, ня маючы магчымасьці атрымаць яскравага і канчатковага адказу на свае запытаньні.

І ня толькі з членамі праўленьня так стаіць справа. На інструктароў таксама „крызіс“, асабліва ў оргаддзеле. Калі вам трэба даведацца аб дзіцячых установах, дык рыхтуйце пару ботаў, бо злавіць інструктара—тав. **Валікую** — вельмі цяжкая задача.

Працаваў рацыяналізатар тав. **Гурвіч**, а зараз пашоў у адпачынак. Яго „замяніў“ т. **Марголін**, які, не пачаўшы працы, таксама пашоў у адпачынак.

Што і гаварыць, — „рацыяналізуюць“.

Добра б, каб РСІ прыслала з сваіх шэрагаў рацыяналізатараў па рацыяналізацыі апарату праўленьня МЦРК, бо тут рацыяналізацыя неабходна

Эмбэ.

Падпісаліся на 100 руб.

Ячэйка КСМ колгасу „Гігант“, Петрыкаўскага раёну (Мазыршчына) падпісалася на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“ у суме 100 рублёў і прыцягнула да падпісі беспартыйную моладзь.

Дубіна.

Зламаць перашкоды

Посьпех бягучай хлеба-гароднінанарыхтоўчай кампаніі залежыць ад удзелу ў ёй ўсяе савецкае грамадзкасьці.

Уся савецкая грамадзкасьць павінна мабілізаваць вакол гэтага пытаньня ўсе свае сілы і сродкі, надаць гэтай справе баявыя бальшавіцкія тэмпы. Але гэтага яшчэ няма.

Профсаюзная організацыя, апрача пасылкі дырэктыў аб аказаньні дапамогі ў правядзеньні загатовак, практычна нічога не зрабіла І толькі ў апошні час пры ЦСПСБ створан штаб, спэцыяльная камісія з прадстаўнікоў ЦСПСБ, ЛКСМБ, РСІ, Белкоопсаюзу і Наркамгандлю, якія зароўна з загатоўчымі організацыямі нясуць поўную адказнасьць за справу забясьпечаньня рабочых.

ЦСПСБ мобілізавала 20 рабочых з вытворчасьці для пасылкі ў загатоўчыя раёны БССР.

Мобілізаваць усе сродкі на захаваньне гародніны

І яшчэ больш адказная задача—гэта захаваць загатоўленую садовіну і гародніну, бо спэцыяльных хавальняў хопіць.

Неабходна організаваць гэтую справу так, каб кожны рабочы зрабіў зараз заяўку на патрэбную яму хаця-б на першыя два-тры месяцы садовіну і гародніну.

Закрытыя ўстановы, больніцы, сталоўкі дзіцячыя дамы і г. д. павінны таксама поўнасьцю скарыстаць свае памяшканьні для захаваньня гародніны на зімовы пэрыод.

Чыгуначнікі і воднікі павінны неадкладна організаваць рабочыя брыгады, якія-б прынялі рашучыя меры ў справе перавозкі і захаваньня гародніны і хлеба сачылі-б затым, каб тэрмінова аслабаняліся пристанцыйныя склады, пакгаўзы ад іншых грузаў.

Выдзеліць для захаваньня хлеба склады закрытых дэпо, майстэрняў і іншых будынкаў, якія знаходзяцца ў распараджэньні чыгункі і параходзтва. Усіх, хто перашкаджае, супраціўляецца і не праводзіць гэтых мерапрыемстваў трэба зараз-жа зьняць з работы і аддаць пад суд.

Ніхто не павінен быць толькі гледачом

Кожны член профсаюзу павінен прыняць актыўны ўдзел у гэтай альбо іншай галіне гэтай работы. ... сілы мобілізаваць на ліквідац... прарываў у выкапаньні загат... хлеба і гародніны, за баявыя б... шавіцкія тэмпы, за палепша... забясьпечаньня рабочых, за моб... зацыю харчовых рэсурсаў.

Рабочыя будаўнікі павінны ... адкладна організаваць рабо... брыгады для праверкі ходу буд... ніцтва.

НК працы павінен прыняць ... залежачыя меры і забясьпеч... будаўніцтва хавальнямі для гар... віны.

Профсаюзам Харчавікоў і ... харч трэба неадкладна мобілізав... усіх спэцыялістых па перапра... цы плода-гародніны, якія працу... у іншых установах, каб забяс... чыць імі фронт загатовак на ... ударнай работы, узнуўшы на ... ўсю адказнасьць за вынікі ... справы.

Загатоўцы: коопэрацыя, сад... плодсаюз,—прачнецеся ад сну!

Грыбы ўсе дзьверы паламалі, ... рабочы спажывец іх чакае.

Чым вы апраўдаецеся за ... гэтай кампаніі? Мы ўпэўнены ... тым, што прокуратура і РСІ ... публікі пацікавяцца вашай раб...

Вясковы комсамол і про... саюзы—тварам да гар... ніны і садовіны

За прарывы ў забясьпеча... рабочых профсаюзы нясуць ад... насьць у роўнай меры з коо... цыяй. Профсаюзы на вёсцы ... ны несьці адказнасьць у ... меры з загатоўчымі організа... за вынікі загатовак хлеба і гар... ніны, а значыць і работу ... яны павінны перабудаваць ... каб поўнасьцю забясьпечыць ... тоўкі.

Комсамольскім організацыям, ... да гэтага часу яшчэ не раскача... ў справе організацыі забясьпеч... ня рабочых гароднінай, садові... загатовак яе, неабходна ра... узмацніць крокі каб нагнаць ... шчанае.

Брыгада па праверцы і ор... зацыі забясьпечаньня рабо... і загатовак на Беларусі

Уюгін, Котаў, Івано...

Адказны рэдактар—Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599